Пралетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 4 (246) | Чацвер, 9 лютага 1956 года. | Цана 20 кап.

ШМАТЛІКІ КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА ГОРАЧА АДАБРАЕ ПРАЕКТ ДЫРЭКТЫЎ XX З'ЕЗДА КПСС

★ ★ ★

ВЕЛІЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

У пярвічных партыйных арганізацыях факультэтаў універсітэта праходзяць партыйныя сходы, дзе камуністы, а таксама беспартыйныя таварышы актыўна абмяркоўваюць праект Дырэктыў па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі.

Вучоныя універсітэта з натхненнем сустрэлі праект Дырэктыў XX з'езда КПСС.

Актыўна прайшлі партыйныя сходы на геолага-геаграфічным і біёлага-глебавым факультэтах. На гэтых партыйных сходах па-дзелавому абмяркоўваліся важнейшыя праблемы перспектыўнага пяцігадовага плана.

Дакладчыкі Ф. В. Баравік і С. П. Рагозін з усёй яснасцю адзначылі, што Дырэктывы XX з'езда КПСС — гэта велічны план далейшага развіцця народнай гаспадаркі на аснове новага, яшчэ больш магутнага уздыму цяжкой прамысловасці.

—Шосты пяцігадовы план,— гаворыць т. Баравік, — гэта творчая справа мільёнаў савецкіх людзей, якія накіроўваюць свае намаганні на ператварэнне у жыццё вялікіх прадвызначэнняў партыі.

На партыйных сходах выступілі тт. Акінчыц, Карулін, Палілаў, Пятровіч, Леуко і іншыя, якія падкрэслілі вялікае значэнне новага пяцігадовага плана у справе далейшага умацавання эканомікі Савецкага Саюза. Партыйныя сходы геолага-геаграфічнага і біёлага-глебавага факультэтаў прынялі рашэнні, накіраваныя на далейшае паляпшэнне выхавання і падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, патрабавалі ад кафедр перагледзець планы навукова-даследчай работы, наблізіўшы іх да задач выканання шостага пяцігадовага плана.

Н. ЯРАВІКОЎ.

АДЗІНАДУШНАЕ АДАБРЭННЕ

26 студзеня адбыўся адкрыты партыйны сход філалагічнага факультэта, прысвечаны абмеркаванню праекта Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1956—1960 гады.

Выступіўшы з дакладам па гэтаму пытанню сакратар партарганізацыі С. Е. Янчанка адзначыў, што навуковыя работнікі і студэнты універсітэта, як і увесь савецкі народ, адзінадушна адабраюць праект Дырэктыў. Дакладчык падрабязна характарызуе гэты важнейшы гістарычны дакумент, як велічную праграму далейшага комуністычнага будаўніцтва у нашай краіне, развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі, тэхнікі, павышэння матэрыяльнага добрабыту працоўных мас, як гіганцкі крок па шляху да комунізма.

І. В. Гутараў, выступіўшы у спрэчках, сказаў, што Дырэктывы XX з'езда КПСС маюць непасрэдныя адносіны да кожнага з нас, што у святле іх патрэбна значна палепшыць навукова-даследчую работу ва універсітэце.

З канкрэтнымі прапановамі і пажаданнямі выступіў дацэнт М. С. Зярніцкі:

—Чаму абавязваюць Дырэктывы XX з'езда КПСС нашу партыйную арганізацыю? Мы павінны працаваць так, каб работа універсітэта была узнята на вышэйшы узровень. Вялікія задачы, пастаўленыя перад савецкім народам, патрабуюць ад нас паляпшэння якасці выпускаемых намі спецыялістаў, абавязваюць пашырыць матэрыяльную базу універсітэта. Вельмі перашкаджае вучэбнай і выхаваўчай рабоце правядзенне заняткаў у дзве зменьі. Дэканат павінен дабіцца, каб заняткі на нашым факультэце праводзіліся удзень, а не вечарам.

Перад навуковымі работнікамі універсітэта стаіць задача — палепшыць вучэбны працэс, ідэйна-тэарэтычны узровень лекцый, узмацніць палітыка-выхаваўчую работу сярод студэнтаў. Універсітэт павінен стаць вядучай навучальнай установай у рэспубліцы гордасцю працоўных Беларусі.

Асобныя праблемы праекта Дырэктыў неабходна глыбока вывучыць з тым, каб мы змаглі у іх святле наладзіць далейшую работу кафедр.

Студэнты, якія ад'язджаюць на канікулы у сельскія мясцовасці, абавязаны прачытаць насельніцтву дакілады аб новым пяцігадовым плане.

Аб той вялікай увазе, якая надаецца партыяй шырокаму выкарыстанню атамнай энергіі у мірных мэтах у новай пяцігодцы, адзначыла у сваім выступленні тав. Лакіза. Аб задачах кафедры, факультэта, універсітэта у цэлым у святле Дырэктыў XX с'езду гаварылі у сваіх выступленнях тт. Ларчанка і Захарава.

Сход адзінадушна адобрыў праект Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1956—1960 годы і прыняў рашэнне — прасіць кіруючыя органы БССР пры распрацоўцы пяцігадовага плана рэспублікі мець на увазе пабудову галоўнага корпуса універсітэта.

В. КАЛЕНЧЫЦ.

Сіла плана—у яго рэальнасці

Комуністы фізіка-матэматычнага факультэта на партыйным сходзе абмеркавалі праект Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі.

З дакладам выступіў Г. С. Маханёк.

— Калектыў фізіка-матэматычнага факультэта з натхненнем адабрае усе мерапрыемствы, намечаныя ў Дырэктывах, накіраваныя на далейшае умацаванне магутнасці Совецкага Саюза, — сказаў тав. Маханёк.

Выступаушыя у спрэчках комуністы тт. Нахімоуская, Халімановіч, Авечкін і іншыя унеслі рад канкрэтных прапаноў, якія непасрэдна звязаны з развіццём фізіка-матэматычнага факультэта. Яны падверглі крытыцы мерапрыемствы, якія праводзяцца ва універсітэце па скарачэнню набору на рад факультэтаў і асабліва на фізіка-матэматычны факультэт.

Калектыў факультэта просіць рэктарат удзяліць самую сур'ёзную увагу арганізацыі спецыяльнасці па вылічальнай тэхніцы і у сувязі з гэтым забяспечыць неабходную матэрыяльную базу.

Выступаушыя у спрэчках унеслі прапанову: прасіць партком і рэктарат універсітэта паставіць на шырокае абмеркаванне грамадскасці перспектыўны план развіцця універсітэта у шостай пяцігодцы.

Комуністы адзінадушна адзначылі, што калектыў фізіка-матэматычнага факультэта прыкладзе усе намаганні у справе арганізацыі творчай актыўнасці работнікаў факультэта, накіраваныя на паспяховае выкананне новай пяцігодкі.

І. ЗЯЦЬКОЎ,
сакратар партбюро фізмата.

Выстаука, прысвечаная XX з'езду КПСС

Ва універсітэце арганізавана цікавая выстаука «Насустрач XX з'езду КПСС». Выстаука паказвае, як совецкія людзі рыхтуюцца да гэтай знамянальнай падзеі, які уклад яны ўносяць у справу развіцця усёй народнай гаспадаркі краіны.

Выстаука адкрываецца вытрымкамі з праекту Дырэктыў XX з'езда КПСС па шостаму пяцігадоваму плану. Далей у шматлікіх малюнках і фатаграфіях расказваецца аб тым, з чым наша краіна падыходзіць да XX з'езда. Так, запаліліся агні Кахоўскай і Нарвскай ГЭС, поўным ходам ідуць работы па будаўніцтву Ангарскай і Іртышскай гідраэлектрастанцый. Наша цяжкая прамысловасць выпускае унікальныя станкі для прадпрыемстваў.

Асобнае месца адведзена развіццю сельскай гаспадаркі краіны. Тут надрукаваны матэрыялы з цалінных земляў; пад загалоўкам «Цудоўны горад» расказваецца аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Наш народ змагаецца за мірнае выкарыстанне атамнай энергіі. У шостай пяцігодцы ўвойдзе у строй значная колькасць атамных электрастанцыі. Стэнд расказвае аб першаі у свеце совецкай электрастанцыі, працуючай на атамным паліве.

Выстаука прыцягвае да сябе ўвагу многіх гледачоў.

У АБСТАНОЎЦЫ БЕЗКАНТРОЛЬНАСЦІ

Заканчыўся першы семестр навучальнага года. У дэканатах факультэтаў, на кафедрах падводзяцца вынікі работы за поугоддзе, намячаюцца задачы далейшай работы. Відавочна, будзе падводзіць вынікі сваей работы і кафедра англійскай мовы. Выкладчыкі гэтай кафедры, як і увесь шматлікі калектыў прафесарау і выкладчыкаў універсітэта, прыкладу нямала намаганняу, каб палепшыць выкладанне англійскай мовы. Аднак у рабоце самой кафедры, у арганізацыі яе работы ёсць істотныя недахопы, якія не могуць не выклікаць сур'ёзнай трывогі.

Кафедра зусім не займаецца вучэбнымі планамі, пытаннямі методыкі выкладання, не кантралюе работу выкладчыкаў. Уся гэтая работа, па сутнасці, пушчана на самацёк. Вядома, што па англінскай мове няма стабільнага падручніка. Для таго, каб не было разнабою, каб была якая-небудзь сістэма, планавасць у рабоце выкладчыкаў,—кафедра павінна распрацаваць вучэбныя планы, вызначыць, якія вучэбныя дапаможнікі, якія тэксты выкарыстаць на курсах і факультэтах, і сачыць за выкананнем гэтых планаў. Аднак загадчык кафедрай С. Л. Дорскі лічыць, відавочна, гэта непатрэбнай абузай: на пасяджэннях кафедры, як аб гэтым сведчаць пратаколы, ні аднаго разу не узнімалася гэтае пытанне. Уся гэта важная справа прадастаўлена на самацёк, кожны з выкладччыкаў вымушан сам вызначыць, які падручнік узяць, якія раздзелы і тэксты вывучаць. Усё гэта прыводзіць нярэдка да разнабою, да таго, што студэнтаў на адным і тым-жа курсе аднаго і таго-ж факультэта розныя выкладчыкі вучаць парознаму, прад'яўляюць да іх неаднолькавыя патрабаванні.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва кафедры няправільна падыйшло да размеркавання вучэбнай нагрузкі выкладчыкам. Стварылася такое становішча, калі большасць выкладчыкаў мае нагрузку на 3—4 факультэтах па 1—2 групы. Гэта адмоўна адбіваецца і на самой якасці выкладання і сур'ёзна абцяжарвае работу выкладчыка. Важна, каб студэнт, перш за усё, рыхтаваўся да чытання спецыяльных тэкстаў. Таму інтарэсы справы патрабуюць каб і выкладчыкі спецыялізаваліся па аднаму—двух профілях. А пры цяперашнім размеркаванні вучэбнай нагрузкі выкладчыкі працуюць падчас на 3—4 факультэтах, і вымушаны падбіраць тэксты і рыхтавацца у розных профілях. Заг. кафедрай спасылаецца на тое, быццам немагчыма спланаваць расклад, калі даваць асноўную нагрузку на адным, максімум на двух факультэтах. Гэта няправільна. Мова вывучаецца на I—IV курсах. Калі, скажам, даць выкладчыку па дзве групы на I і II курсах, па адной групе на III і IV курсах—гэта поўны аб'ём нагрузкі. Такая планіроўка упауне магчыма на філфаку, фізмаце, біёлага-глебавым і геолага-геаграфічным факультэтах, дзе ёсць па два аддзяленні. Праўда, гэта, магчыма, прымусіць некалькі больш падумаць над планіроўкай работы і над раскладам. Але-ж мы павінны зыходзіць не з асабістай выгады, не падладжвацца пад расклад, а планаваць сваю работу з уліку галоўнай задачы— паляпшэння навучання мове, а гэтая задача настойліва патрабуе стабільнага замацавання выкладчыкаў за факультэтамі, і гэта абавязкова неабходна улічыць на будучае.

Вынікам няправільнага планавання вучэбнай нагрузкі з'яуляецца адрыу выкладчыкаў кафедры ад жыцця факультэтаў. Кафедра англійскай мовы — агульнаўніверсітэцкая. Але паколькі ні адзін з выкладчыкаў блізка з вучэбным працэсам ні аднаго з факультэтаў не звязан—яны, як правіла, не удзельнічаюць у жыцці універсітэта. Калі некаторых з выкладчыкаў запрашалі на адкрыты партыйны сход факультэтаў, яны не без падставы адказвалі, што не ведаюць—на які факультэт ім ісці. Гэты адрыу ад жыцця праяўляецца і у тым, што работнікі кафедры англійскай мовы і сам загадчык тав. Дорскі амаль ніколі не бываюць на навуковых сесіях і канферэнцыях, на Вучоных Советах, на іншых масавых мерапрыемствах універсітэта.

Кафедра зусім не займаецца пытаннямі методыкі выкладання. За цэлы семестр кафедра ніводнага разу не абмяркоўвала пытання аб вынікаx узаемнаведвання заняткаў. Акрамя тав. Кавanавай, ні адзін з выкладчыкаў не наведаў заняткаў, не прысутнічаў ні на адных занятках выкладчыкаў і сам тав. Дорскі. Аб якім кантролі за работай, аб якой метадычнай вучобе выкладчыкаў можа ісці пасля гэтага размова?

Пасля усяго гэтага узнікае законнае пытанне—чым наогул займалася кафедра, яе загадчык, якія пытанні яны абмяркоўвалі? Трэба адзначыць, што на кафедры стварылася нездаровая абстаноука. Тав. Дорскі супрацьпаставіў сябе калектыву, не хоча лічыцца з думкамі членаў кафедры. У выніку гэтага нярэдка пасяджэнні кафедры ператвараюцца проста у спрэчкі па неістотных пытаннях. На адным з пасяджэнняў кафедры тав. Дорскі, напрыклад, спрабаваў навязаць работнікам кафедры новую тэму навуковай работы, хоць яго усе пераконвалі, што заканчваецца год, работа амаль зроблена, і няма ніякіх падстаў мяняць тэму. Або, напрыклад, 6 студзеня двухгадзіннае пасяджэнне кафедры было патрачана на абмеркаванне пытання «Аб недыцыплінаванасці членаў кафедры». Тав. Дорскі сцвярджаў, што усе недысцыплінаваныя, а работнікі кафедры пераконвалі свайго загадчыка, што трэба больш чоткa і разумна планаваць пасяджэнні, бо яны не могуць у адзін і той-жа час весці заняткі і прысутнічаць на пасяджэнні.

Цяжка паверыць, каб вучэбная частка універсітэта не ведала аб гэтых сур'ёзных недахопах у рабоце кафедры англійскай мовы. Ведае аб гэтым і адказны за вучэбную работу парткома БДУ тав. Леуко. Між тым не былі прыняты меры, каб наладзіць работу кафедры, згуртаваць калектыў, падказаць яму яго недахопы і патрабаваць сапраўднай работы.

Кафедра англійскай мовы укамплектавана кваліфікаванымі выкладчыкамі, здольнымі значна палепшыць падрыхтоўку студэнтаў. Неабходна прыняць самыя неадкладныя меры, якія-б мабілізавалі калектыў кафедры і прывялі да актывізацыі яе работы.

СУСТРАКАЮЧЫ ЗНАМЯНАЛЬНУЮ ДАТУ

Совецкія людзі, сустракаючы слаўную дату—дзень адкрыцця XX з'езда КПСС, прыкладаюць усе сілы для таго, каб сустрэць яе новымі працоўнымі поспехамі.

У які цэх друкарні БДУ ні заглянеш сёння—усюды бачыш высокі працоўны уздым. Комсамолкі-наборшчыцы Ліда Панава, Вера Сяргеева, Маша Довнар, лінатыпісткі Ліда Іванова, Ніна Лантасава, старэйшыя работнікі друкарні З. Кофман, З. Грынько, Е. Карпава, А. Семяшка, Г. Гніліцкая працуюць так, каб сваёй стараннай працай парадаваць Радзіму.

СТАРОНКА ЗАВОЧНІКА

З НАМІ — МАЛАДОСЦЬ

Студэнты-завочнікі III курса гістарычнага факультэта стаялі у калідоры.

— Вось калі-б некалькі гадкоу скінуць, толькі-б на «пяць» вучыуся, — сказау адзін.

— Няужо табе гады перашкаджаюць вучыцца?—спытаў яго Іван Аляксандравіч Ігнацьеу.

— Як быццам табе не перашкаджаюць! «Маладосць шчаслівая тым, што у яе ёсць будучыня», сказау адзін вучоны. Мы-ж, так кажучы, ужо узялі будучыню, а цяпер вярнуліся да мінулага, каб запоуніць прагал.

Іван Аляксандравіч паглядзеу на таварыша так, быццам той змяняуся на яго вачах. У размову умяшалися многія студэнты. Кожны выказваў сваю думку. Нарэшце сышліся на тым, што гады—не перашкода для вучобы. Нічога, што жыццё на тварах многіх трэцякурснікаў праклала глыбокія маршчыны, што у іншых паявілася сівізна. Галоунае, што вочы ва усіх з любоую і верай глядзяць у свет, а рукі патрабуюць любой працы. Не такія людзі не могуць старэць. Возьмем Івана Аляксандравіча Ігнацьева — студэнта таго-ж III гістфака. Як яго ўзрушвала жыццё, якіх нечаканасцей не падрыхтоувала.

Скончыу да вайны дзесяцігодку.. Марыу у педагагічны інстытут паступіць. І раптам вайна. Ён прышоў у ваенкамат:

— Пашліце на фронт!

Аказалася, што на фронт адразу нельга. Яго накіравалі у ваеннае вучылішча. І вось ён—лейтэнант-артылерыст. Ваяваў на трох беларускіх франтах. І нядрэнна ваяваў. Не здарма дзевяць урадавых узнагарод упрыгожваюць яго грудзі. У 1953 годзе маёр Ігнацьеу дэмабілізавауся. І адразу-ж аддауся сваей любімай прафесіі настауніка. Пастуніу на завочны факультэт універсітэта. Здаецца, навошта паступаць? Скончыць-жа ён яго, і быццам нічога не зменіцца у жыцці. Таксама будзе выкладаць гісторыю ў той самай Азарыцкай сярэдняй школе. Толькі Іван Аляксандравіч інакш разважае. Ён настаунік, выхавацель дзяцей. Ён патрабуе, каб дзеці раслі духоуна. А якое права ён мае патрабаваць, калі сам на месцы? Трэба вучыцца, настойліва, упорна.

Іван Аляксандравіч многа чытае, робіць выпіскі з кніг. За час вучобы ў яго не было ніводнай «тройкі». Вакол яго заусёды можна убачыць студэнтаў, якім з ахвотай растлумачвае незразумелае. Энергіі ў яго хоць адбауляй. І тут, ва універсітэце, і у школе ён усім цікавіцца, кожнаму аказвае дапамогу. Іван Аляксандравіч адзін з тых вечна маладых душой людзей, якія з поуным правам могуць сказаць сабе:

— Маладосць з нам!

А. ГЕРУС.

„Нядрэнна быць вечным студэнтам!“

Перад намі пажоуклы лісток паперы. Буйным, размашыстым почыркам, з вялікай колькасцю памылак на ім напісана: «Маю вялікае жаданне вучыцца у БДУ. Прашу залічыць мяне на І курс завочнага факультэта». Гэтая заява была напісана яшчэ ў 1945 годзе Г. Шасцітка. У тымжа годзе яго прынялі ва універсітэт на аддзяленне гісторыі.

З таго часу прашло 11 год. Колькі выдатных спраў адбылося у нашай краіне за гэтыя гады! Колькі выросла праслауленых людзей! Колькі змяненняў у кожнага чалавека! Учарашні школьнік сёння становіцца студэнтам, наватарам вытворчасці. Кожны дзень у нас адкрываецца нешта новае, важнае, значнае.

Але застыу на адным месцы вышэйпамянёны Г. Шасцітка.—загадчык аддзелам Радунскага РК КПБ Гродзенскай вобласці. Ён па-ранейшаму студэнт універсітэта, па-ранейшаму штогод прыязджае здаваць экзамены. Але шасцігадовы тэрмін навучання не можа завяршыць нават за 11 год.

А вось асабістая справа завочніка Саса Анатолія Пятровіча Пачата яна таксама у 1945 годзе—з таго дня, калі А. Сас быу залічан на І курс аддзялення рускай мовы і літаратуры. Але, відаць, забаунай прагулкай па калідорах універсітэта уяуляу сабе А. Сас вучобу ва універсітэце. І у 1949 годзе яго выключаюць з ліку завочнікау. Сас тады звяртаецца ў рэктарат з просьбай аднавіць яго на III курс філфака. «Усе задачы, якія паставіць перада мной вучоба, будуць паспяхова вырашацца»,—пісау ён у заяве. І як-жа вырашае іх Сас, сакратар партарганізацыі МТС у Заслаульскім раёне пасля аднаулення яго на завочным аддзяленні? А вельмі проста. За 6 гадоу (з 1949 па 1955 г.) сяк-так здае экзамены за 3—5 курсы.

Зусім нядрэнна... Яшчэ поудзесятка гадоу, і... дыплом будзе у кармане!

Ужо 10 гадоу займаецца на завочным факультэце Елена Васільеуна Цюрахіна, супрацоунік адной з Мінскіх бібліятэк. Паступіушы у 1947 годзе на І курс аддзялення рускай мовы і літаратуры, яна марудна «перапаузала» з курса на курс. У 1952 годзе за невыкананне вучэбнага плана Цюрахіну выключаюць з універсітэта. У рэктарат прыходзіць жалобнае пасланне: «Аднавіце! Мне не 20 гадоу, а 40... Я павінна давучыцца».

Дык дазвольце, тав. Цюрахіна, задаць вам і вашым таварышам -завочнікам з дзесяцігадовым «стажам» вучобы законнае пытанне: «Чаму вы не вучыцеся добрасумленна? Вы трывала занялі месца ва універсітэце. А на яго-ж ёсць дзесяткі жадаючых сумленна вучыцца! І толькі таму яны не могуць павышаць сваю кваліфікацыю, паглыбляць веды, займаючыся ва універсітэце, што на гэтых месцах дзесяткі гадоу сядзяць Сасы, Шасціткі, Цюрахіны, Парфіновічы, Агейчыкі, якія і не думаюць заканчваць універсітэт у адпаведныя 6 гадоу.

— Дыплом?—гэта чыстая фармальнасць;—гавораць яны. Як-небудзь да старасці атрымаем яго. А пакуль нядрэнна: два разы у год дзяржава дае платны водпуск. Нас не чапай, не гані—мы з месца не кранемся.

Вось яна, мараль вечных студэнтау!

Дэкану завочнага аддзялення універсітэта тав. Івашыну трэба сур'ёзна падумаць над тым, якая і каму карысць ад падобных студэнтау. Ці не пара на самай справе зрушыць іх з месца і прадаставіць магчымасць займацца ва універсітэце тым, хто хоча вучыцца па-сапраўднаму?

Г. ШАТРОВА.

БАЦЬКОУСКІ ДОМ

Хаціна над нёманскім плёсам.
На тын узбіраецца хмель.
Да сініх глыбокіх нябёсау
Руку працягнуу журавель.

Ля гэтае студні, ля тыну
Я сцежкі гадамі таптау,
Праводзіу дадому дзяучыну,
Аб першым каханні шаптау.

...Далёка ад роднае хаты
Праушлі у дазорах гады.
Дамоу я вярнууся салдатам
З суровай Курыльскай грады.

Сустрэча... Старэнькая маці
Не верыць, глядзіць на мяне,
Цалуе на ганку і у хаце
І бліжай да сэрца хіне.

І стыне сляза на шынелі...
І шэпча матуля: «Сынок,
Дзяучына згуляла вяселле
І з'ехала у горад даўно».

Цяпер я не ведаю толькі
Ці рада за уласны ты лёс.
Цябе не шкада мне ніколькі,
Шкада толькі матчыных слёз.

Іван КАЛЕСНІК,
студэнт-завочнік.

Заметкі экзамінатара

ЭКЗАМЕНЫ І ЗАЛІКІ ПА ЗАРУБЕЖНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Ідуць экзамены і залікі па гісторыі замежных літаратур на IV і V курсах завочнага факультэта. Мы, як экзамінатары, маглі-б сказаць, што карціна, якая складваецца з уражанняу першых дзён, не толькі адлюстроувае розны узровень непасрэднай падрыхтоукі, але і начытанасць студэнтау у класічных тэкстах і, галоунае, пэуны узровень запатрабаванняу і інтэлектуальнай культуры. Ці можна апраудаць студэнта IV курса В. І. Меляшчыка, які не чытаў твораў Мальера і Гётэ, вывучаемых у сярэдняй школе, а студэнтка Н. А. Скачко, другагодніца V курса, не чытала твораў Р. Ралана і Т. Драйзера, а пераведзеная (за якія заслугі?) з стацыянара студэнтка V курса В. А. Пляц, зусім адмовілася адказваць...

Ці можна думаць, што, як гавораць некаторыя таварышы, завочнікі пастаулены у выключна цяжкія умовы, якія перашкаджаюць іх самастойнай рабоце? Слоу няма, несумненныя цяжкасці у рабоце завочнікау ёсць. І мы, работнікі універсітэта, павінны з дапамогай завочнага факультэта актывізаваць кансультацыйную работу паміж сесіямі, наладзіць больш чоткае абслугоуванне метадычнымі дапаможнікамі. Але ці толькі у гэтым справа. Вопыт паказвае, што студэнты-завочнікі, якія працуюць педагогамі на перыферыі, прыкметна растуць на нашых вачах, пераадольваюць значныя цяжкасці і авалодваюць універсітэцкімі ведамі. Так, напрыклад, настаўніца Лепельскай раённай школы Л. Г. Бальшэвідцава (IV курс рускага аддзялення) вельмі змястоуна адказвала на пытанні — Жыццё і творчасць Дантэ і высокія камедыі Мальера. Студэнтка V курса Н. І. Пятрова з веданнем апошняй публікацыі і вялікім пачуццём расказвала аб творчасці Э. Войніч і прататыпах рамана «Овад». Грунтоуныя адказы у першыя дні можна было чуць ад студэнтау І. Ф. Вінцэвіч, (V курс), Аркада'ева (IV курс), В. А. Рэдотава (IV курс) і некаторых іншых.

Д. ФАКТАРОВІЧ,
дацэнт.

Н. ЛАПІДУС,
ст. выкладчык.

Завочнікі прыехалі...

Ветліва сустрэу універсітэт завочнікаў. Інтэрнаты і кабінеты, лабараторыі і чытальныя залы прадастаулены да іх паслуг. Здавалася-б, студэнты-завочнікі павінны былі адказаць на гэтыя клопаты добрымі паводзінамі. Нажаль факты гавораць аб адваротным.

...У корпусе фізмата стаіць натоуп людзей. Усе яны у паліто, у галауных уборах. Такая-ж карціна і у іншых карпусах. У біякорпусе кураць на калідорах, акуркі кідаюць на падлогу, на батарэі. Больш таго, нават плююць тут-жа. Некаторыя здагадаліся у першы дзень прыезду ва універсітэт напіцца да беспрытомнасці.

Каля століка ў вестыбюлі біякорпуса заусёды вельмі многа смецця. Ужо у першы дзень сесіі завочнікі вялі сябе так дрэнна, што прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце тав. Малышаў вымушан быу зрабіць заўвагу. Выпускнік універсітэта тав. Н. Сакалоускі не падумаў нават устаць, калі з ім гаварыў тав. Малышаў.

А вось другая карціна. Кабінет друку... Толькі што скончыліся лекцыі, і студэнты-завочнікі пакінулі пакой. Хутка сюды прышоу студэнт V курса гістарычнага факультэта Іван Помазау. Разваліушыся на двух стулах, без абутку, ён чытаў канспект. Непадалёку, на батарэі ўзвышаліся яго чорныя валёнкі:

—Замоклі, няхай падсохнуць,— адказау ён.

На сталах і стулах валяліся кнігі, канспекты, верхняя вопратка. Ён адзін заняу поукабінета.

Нядрэнна! Нават і дома так не прыстроішся.

І як не абурышся, калі гэты чалавек, які праз год атрымае вышэйшую адукацыю, бессаромна заяуляе:

— Выбачайце, я не ведаў, што гэтак нельга.

Так, нельга! Нельга весці сябе бяскультурна, не ведаць элементарных правіл паводзін! А многія завочнікі, відаць, ніколі не былі знаёмы з гэтымі правіламі.

Дэкану завочнага факультэта тав. Івашыну трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на паводзіны студэнтау-завочнікаў.

К. ЗАЛУЖНЫ.

КАРОТКІЯ СІГНАЛЫ

* *

Студэнты І курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры (І група) 7 лютага сарвалі семінарскія заняткі па асновах марксізма-ленінізма. На семінар не з'явіуся ні адзін студэнт-завочнік.

П. САЛТЫКОУ.

* *

Дрэнна падрыхтаванымі да экзамена па анатоміі раслін з'явілися на сесію студэнты І курса аддзялення біялогіі. Дацэнт С. В. Калішэвіч, які прымаў экзамен па гэтаму прадмету, вымушан быў ацаніць адказы большасці першакурснікаў нездавальняючай адзнакай.

Е. МЯТЛІНА.

У ліку першых

Чымсьці недасягальным здавауся калісьці Ніне Беларускі дзяржауны універсітэт імя Владзіміра Ільіча Леніна.

— Там, напэуна, вучацца самыя здольныя. Куды ўжо мне? —хвалявалася дзяучына, калі сяброукі спыталі яе аб універсітэце пасля таго, як Ніна скончыла педвучылішча.

Ніна Шырай пайшла працаваць у школу. Першыя дні самастойнай працы! Яны запомніліся на усё жыццё. Як добра сябе адчуваеш, калі ведаеш, што табе даручана вялікая справа—выхоуваць маладое пакаленне. Прауда, спачатку былі і цяжкасці. Сярод навучэнцаў было многа непасед, парушальнікаў дысцыпліны, адстаючых. Трэба было да кожнага з іх па-свойму падыйсці. Адзіночныя і групавыя гутаркі, уменне зацікавіць сваім прадметам, гутаркі з адстаючымі пасля урокау—усё гэта дапамагло маладой настаўніцы заваяваць павагу і любоу сярод навучэнцаў.

Ніна Шырай увесь час вяла вялікую грамадскую работу Да гэтага года яна з'яулялася сакратаром настаўніцкай комсамольскай арганізацыі школы. Вялікай пашанай карысталася яна і сярод калгаснікаў як адна з лепшых агітатараў. Калектыу настаўнікау рэкамендаваў яе у партыю. Цяпер Ніна Шырай—кандыдат у члены КПСС.

—Я вельмі люблю свае прадметы—рускую мову і літаратуру. І у той-жа час я разумею, наколькі яшчэ недастаткова я іх ведаю, — гаворыць Ніна. І яна штодзённа паглыбляе свае веды.

У 1953 годзе споўнілася даунішняя мара дзяучыны—яна стала студэнткай вялікага калектыву універсітэта—завочнага факультэта.

На гэтую зімовую экзаменацыйную сесію Ніна Шырай прыехала добра падрыхтаванай. «Пяцёркі» у заліковай кніжцы сведчаць аб добрасумленнасці і настойлівасці дзяучыны, аб жаданні вучыцца.

— Мне, дарослай, сорамна было-б перад сваімі выхаванцамі дрэнна вучыцца,—жартуе Ніна.

І на самай справе за тры гады навучання ва універсітэце Ніна Шырай атрымала усяго тры «добра», а астатнія-ж адзнакі у яе заліковай кніжцы—«выдатна».

Многім завочнікам не пашкодзіла-б, калі-б яны падзяліліся з маладым педагогам вопытам падрыхтоукі да экзаменау.

М. МУРАШКА.

АВАЛОДВАЮЧЫ ЛЮБІМАЙ ПРАФЕСІЯЙ

Амаль кожны, хто здае экзамены на аддзяленні журналістыкі, мае пэунае дачыненне да газетнай справы. Прафесія журналіста цікавая, захапляючая, але разам з тым і нялёгкая.

...Ля аудыторыі, дзе здаюць экзамены другакурснікі аддз. журналістыкі, не змаукаюць размовы. Па гамонцы—таропкай, з запытальнай інтанацыяй—можна заключыць, што людзі хвалююцца. Але раптам гаворка сціхае. Некалькі чалавек накіроуваецца насустрач вышаушаму.

— Што атрымау, Саша?

— Добра, — адказвае Аляксандр Багданаў.

Сябры распытваюць, хвалююцца: іх таксама чакае білет.

— Хутчэй здавай,—звяртаецца Саша да свайго сябра.—Сходзім у кіно, на шырокаэкраннае.

— Абавязкова трэба схадзіць,— вазначае хтосьці са студэнтау. Як гэта, наведаць Мінск, і не пабыць у шырокаэкранным кіно?

Аляксандр Багданаў—чалавек не малога жыццёвага вопыту. Ён працаваў на Урале рэдактарам гарадской газеты. Затым пераехаў у Мінск. Набыць вышэйшую адукацыю яму, як і многім, перашкодзіла Айчынная вайна. Аднак Аляксандр рашыу прыкласці усе сілы, каб скончыць універсітэт, стаць сапраудным журналістам. Летам два гады назад мара яго збылася. Ён паспяхова вытрымау уступныя экзамены і быў залічан на завочнае аддзяленне. Затым па закліку партыі і урада Аляксандр Багданаў едзе працаваць у Бярэзінскую МТС. Зараз ен узначальвае партыйную арганізацыю гэтай машына-трактарнай станцыі. На старонках абласной газеты «Мінская прауда» можна часта сустрэць карэспандэнцыі, інфармацыі маладога журналіста.

Мінула два гады упартай вучобы. Нялёгкая справа спалучаць працу і заняткі. Дэталёвае авалоданне кожным прадметам патрабуе ад студэнта-завочніка сістэматычнай працы, нямала бяссонных начэй.

Хутка скончыцца зімняя экзаменацыйная сесія, завочнікі раз'едуцца па розных кутках Беларусі. Іх чакаюць віншаванні сяброу, таварышау, родных працоуных калектываў.

Н. ЖЫГОЦКІ,
студэнт-завочнік II к. аддз. журналістыкі.

АТ 02924 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаунага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 209 Тыраж 2 000. Рэдактар А. ВОЛК.